# БАРЫС КІТ – БЕЛАРУСКІ НАСТАЎНІК І АМЕРЫКАНСКІ ВУЧОНЫ

## Шлях служэння асветніцтву і навуцы



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар

**У сваёй кнізе «Доўгая дарога дадому» Васіль Быкаў шмат разважае аб сутнасці подзвігу на вайне. Паэтызуючы гераізм і стойкасць савецкіх салдат, гатовых да любых выпрабаванняў дзеля перамогі над ворагам, пісьменнік працягвае: «Калі ж подзвіг здзяйсняе той, хто прызначаны зусім для іншае, мірнай, справы, тое ўжо ёсць штось выключнае і набывае асаблівае значэнне» [1, с. 339]. У якасці прыкладу Быкаў прыводзіць культурна-асветніцкую дзейнасць беларускіх настаўнікаў на акупіраваных немцамі тэрыторыях. Нягледзячы на пагрозу з боку немцаў, гэтыя людзі лічылі сваім абавязкам вучыць дзяцей, захоўваць нацыянальную культуру і тым самым не далі здзічэць цэламу пакаленню. Сярод узгаданых пісьменнікам педагогаў быў і Барыс Уладзіміравіч Кіт, з якім Васіль Быкаў неаднаразова сустракаўся і нават дапамагаў яму пры напісанні кнігі ўспамінаў.**

### Вызначэнне прызвання

Чвэрць яркага жыцця Барыса Уладзіміравіча прайшла ў Беларусі. Нарадзіўся ён у 1910 г. у Санкт-Пецярбургу ў сям'і служачага Міністэрства пошт і тэлеграфаў, але ў 1918 г. бацька, беларус па нацыянальнасці, перавёз сям'ю на сваю радзіму, у вёску Агароднікі, што на Навагрудчыне (зараз Агароднікі ўвайшлі ў межы г. п. Карэлічы). Барыс змалку быў далучаны да працы: даглядаў малодшых брата і сястру, калі бацькі былі ў полі, пасвіў свойскую жывёлу [5, с. 186–187]. Зімовымі вечарамі бацька вучыў старэйшага сына грамаце. Дзякуючы прыродным здольнасцям падлетак хутка навучыўся пісаць і чытаць і быў адразу прыняты ў чацвёрты клас мясцовай польскамоўнай школы (па Рыжскім пагадненні 1921 г. заходняя тэрыторыя Беларусі апынулася ў складзе Польшчы). Вучыўся Барыс надзвычай старанна, асабліва любіў матэматыку і маляванне. Яго малюнкі нават выстаўляліся на мастацкай выставе ў Познані.



Нягледзячы на антыбеларускую палітыку тагачаснага польскага ўрада, намаганнямі Беларускай сялянска-рабочай грамады ў шэрагу населеных пунктаў удалося захаваць беларускія школы. Сярод іх была Навагрудская беларуская гімназія, якая за 15 гадоў свайго існавання выхавала шмат шчыра адданых Бацькаўшчыне людзей. У 1926 г. у гэтую навучальную ўстанову паступіў і Барыс Кіт – адразу ў 6 клас. За два гады навучання ён вылучыўся не толькі выдатнай вучобай, але і актыўнай грамадскай дзейнасцю: арганізоўваў культурна-асветніцкія гурткі па навакольных вёсках, у гімназіі наладжваў літаратурныя вечарыны, ініцыяваў стварэнне літаратурнага гуртка, пісаў палымяныя вершы і чытаў іх на пасяджэннях аматараў паэзіі.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ



Актыўная грамадска-асветніцкая дзейнасць настаўнікаў і вучняў гімназіі напалохала польскія ўлады. Былі арыштаваны найбольш актыўныя настаўнікі і гімназісты, у тым ліку і Барыс Кіт. Некалькі дзён у засценках дыфензівы іх прыдзірліва дапытвалі, але ніхто з арыштаваных ні ў чым не прызнаўся, ніхто нікога не выдаў. Урэшце паліцэйскія вымушаны былі ўсіх адпусціць.

У 1928 г. Барыс Кіт вытрымаў выпускныя экзамены ў гімназіі і атрымаў атэстат сталасці. Выдатныя і добрыя адзнакі давалі юнаку права на стыпендыю і паступленне ў Віленскі ўніверсітэт. І ён паступіў – на фізіка-матэматычны факультэт.

У 1920-я гг. ва ўніверсітэце існаваў шэраг патрыятычных студэнцкіх арганізацый. Барыс Кіт з першага курса ўключыўся ў іх дзейнасць. Ён пастаянна наведваў сходы Таварыства беларускай школы, быў актыўным членам Беларускага студэнцкага саюза, супрацоўнічаў са студэнцкай карпарацыяй «Скарыніяна».

Падчас вучобы ва ўніверсітэце студэнт адначасова працаваў настаўнікам матэматыкі ў Віленскай беларускай гімназіі, а потым, пасля заканчэння ўніверсітэта, застаўся ў штаце яе педагогаў.

## Барацьба за нацыянальную школу

У 1934 г. польскія ўлады зачынілі Навагрудскую беларускую гімназію, а яе навучэнцаў прымусова пачалі пераводзіць у польскую дзяржаўную гімназію. Даведаўшыся пра гэта, Барыс Кіт паехаў у Навагрудак, дзе агітаваў вучняў не паступаць у польскую гімназію, а пераводзіцца ў Віленскую беларускую. Мясцовыя ўлады ўбачылі ў гэтым учынку іншагародняга педагога падрыў польскай дзяржаўнасці і спрабавалі арыштаваць Кіта, але дэмакрат Шалянгоўскі спыніў праследаванне настаўніка.

У канцы 1930-х гг. шавінізм польскіх улад узмацніўся яшчэ больш, і ў верасні 1939 г. Віленская гімназія была пераведзена на польскую мову навучання. Але ў гэтым жа годзе, пасля далучэння Вільні і шэрага тэрыторый сучаснай Літвы да БССР, Віленская беларуская гімназія аднавіла сваю дзейнасць. Яе дырэктарам быў прызначаны Барыс Уладзіміравіч Кіт. У той кароткі перыяд свайго існавання (у снежні 1939 г. па рашэнні І. Сталіна Вільня і значная частка спрадвечных беларускіх тэрыторый былі перададзены Літве) гімназія робіцца своеасаблівым цэнтрам беларускай самасвядомасці. Яе педагогі (М. Гарэцкі, А. Грыневіч, С. Паўловіч, А. Смоліч, Р. Шырма) і вучні жылі ідэяй нацыянальна-культурнага адраджэння, урачыста адзначалі ўсе традыцыйныя беларускія святы, размаўлялі выключна на беларускай мове [2, с. 279–280].

Пасля ўваходжання Вільні ў склад Літвы Барыс Кіт прыклаў велізарныя намаганні, каб перавезці навучэнцаў сваёй гімназіі ў БССР, у прыватнасці, у Навагрудак. Яму ўдалося пераканаць мясцовыя савецкія ўлады аднавіць там беларускую гімназію.

У сваёй педагагічнай і адміністрацыйнай дзейнасці Б. Кіт абапіраўся на лепшы дыдактычны вопыт папярэднікаў, якія імкнуліся адстойваць ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння. У выніку педагагічны калектыў Навагрудскай гімназіі, як адзначае Л. С. Савік, «нягледзячы на цяжкае матэрыяльнае становішча, выхаваў шэраг адукаваных, таленавітых асоб, высокамаральных інтэлігентаў з глыбокім пачуццём нацыянальнай і чалавечай годнасці» [3, с. 31].

Педагагічная дзейнасць маладога дырэктара была высока ацэнена тагачасным кіраўніцтвам народнай асветы Заходняй Беларусі. Барыса Уладзіміравіча прызначаюць інспектарам Баранавіцкай адукацыйнай акругі, у якую ўваходзілі ўсе адукацыйныя ўстановы Баранавіцкага, Валожынскага, Ваўкавыскага, Навагрудскага і Слонімскага паветаў. У неспрыяльных палітычных, эканамічных і ідэалагічных умовах канца 1930-х гг. энергічны інспектар здолеў знайсці ў дзясятках мястэчак і вёсак акругі памяшканні для новых школ, забяспечыць падручнікамі, матэрыяльна і маральна заахвоціць настаўнікаў, каб яны мелі магчымасць плённа працаваць. Даследчыкі жыццядзейнасці Б. Кіта лічаць, што толькі на працягу 1940 г. пры яго непасрэдным удзеле былі адкрыты сотні пачатковых і сярэдніх школ.

## Асветніцтва з рызыкай для жыцця

Другая сусветная вайна прыпыніла самаадданую працу Барыса Уладзіміравіча на карысць беларускай асветы. Гітлераўцы ўсталявалі жорсткі акупацыйны рэжым, праследавалі камуністаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тых, хто пры савецкай уладзе займаў кіруючыя пасады. Барыс Уладзіміравіч вырашыў перабрацца ў мястэчка Лебедзева (непадалёк ад Маладзечна), дзе жылі бацькі жонкі.

Б. Кіт быў перакананы, што вайна не павінна пазбавіць адукацыі дзяцей, і ён, спрактыкаваны педагог, пачынае выкладаць матэматыку і нямецкую мову ў мясцовай школе. На акупіраваных тэрыторыях гітлераўцы дазвалялі ствараць толькі пачатковыя і вузкапрафесійныя школы. Гэтую акалічнасць і вырашыў скарыстаць Барыс Уладзіміравіч. Ён папрасіў ва ўлад дазволу адкрыць у Маладзечне настаўніцкую семінарыю і атрымаў яго. Як заўжды, ён хутка здолеў наладзіць адукацыйны працэс у гімназіі для 300 юнакоў і дзяўчат. Але нечакана прыйшла небяспека адтуль, адкуль яе ніхто не чакаў. Камісар Вілейскай акругі палічыў, што для рэгіёна дастаткова адной Вілейскай настаўніцкай семінарыі, і загадаў спыніць дзейнасць аналагічнай навучальнай установы ў Маладзечне, а яе дырэктара – арыштаваць. Аднак неўзабаве Б. Кіт быў вызвалены з дапамогай сваіх былых вучняў і прызначаны дырэктарам настаўніцкай семінарыі ў Паставах, якая не была пад кантролем камісара Вілейскай акругі.

Думка аб стварэнні ў Маладзечне адукацыйнай установы не пакідала Барыса Уладзіміравіча. Перадаўшы Пастаўскую семінарыю ў надзейныя рукі, ён рушыў у Маладзечна, але па дарозе быў арыштаваны гестапаўцамі. На допытах у Кіта патрабавалі даць інфармацыю аб партызанскіх атрадах, іх камандзірах, сувязных. Самога арыштанта гітлераўцы таксама палічылі партызанскім сувязным. Паўтара месяцы ён правёў у глыбоцкіх і вілейскіх турмах, перажыў жахі многіх допытаў і ўжо не спадзяваўся на вызваленне. І зноў заступніцтва былых вучняў выратавала Барыса Уладзіміравіча ад расстрэлу.

Пасля вызвалення нястомны асветнік прыняўся за стварэнне ўжо не сярэдняй школы, а вышэйшай навучальнай установы – на базе гандлёвай школы. Употай ад немцаў навучанне ў Адміністрацыйна-гандлёвым іституце вялося па праграмах ВНУ. Студэнтамі гэтай навучальнай установы былі юнакі і дзяўчаты з Ашмянскага, Вілейскага, Маладзечанскага, Радашковіцкага паветаў.

Залічаныя ў інстытут юнакі і дзяўчаты не падпадалі пад угон у Германію на прымусовую працу, таксама іх нельга было прыцягваць да рыцця акопаў, рамонту дарог і іншых работ на карысць акупантаў. Такім чынам, Кіт ратаваў не адну сотню маладых жыццяў. Праз пэўны час звесткі аб тым, што дырэктар гандлёвай школы наладжвае адукацыйны працэс па планах вышэйшай навучальнай установы, дайшлі да акупацыйных улад. Было загадана тэрмінова спыніць гэтую дзейнасць, але Б. Кіт, рызыкуючы жыццём, завяршыў поўны курс навучання студэнтаў.

### З асветнікаў – у вучоныя

На вызваленых ад нямецка-фашысцкіх акупантаў тэрыторыях савецкія ўлады жорстка каралі тых грамадзян, што працавалі пры гітлераўцах у дзяржаўных установах. Барыс Кіт гэта ведаў і таму вымушаны быў з сям'ёй ад'ехаць на Захад.

На Захадзе сям'ю Кіта чакала невядомасць. Спачатку яны апынуліся ў лагеры для перамешчаных асоб непадалёк ад Мюнхена, дзе знаходзіліся ў асноўным украінцы. Для моладзі тут была арганізавана ўкраінская нацыянальная гімназія. Вопытных педагогаў не хапала, таму Б. Кіта адразу запрасілі выкладаць матэматыку. Настаўнічаў ён ва ўкраінскай гімназіі тры гады і адначасова сам вучыўся на медыцынскім факультэце Мюнхенскага ўніверсітэта.

У 1948 г. Барыс Уладзіміравіч вырашыў перабрацца з сям'ёй у ЗША, дзе хуткімі тэмпамі развіваліся фундаментальныя навукі. Да таго ж, у Амерыцы ўжо жылі некалькі сваякоў жонкі, якія дапамаглі ўладкавацца і сям'і Кіта. Неўзабаве Барысу Уладзіміравічу пашчасціла атрымаць пасаду хіміка ў лабараторыі фармацэўтычнай фірмы. Праз два гады ён пераязджае з Саўт-Рывера ў Лос-Анджэлес, дзе размяшчалася вядомая амерыканская фірма «North American Aviation». Сферай яе дзейнасці было праектаванне інтэркантынентальных ракетных сістэм. Барыс Кіт са сваёй грунтоўнай фізіка-матэматычнай і хімічнай адукацыяй цалкам адпавядаў строгім патрабаванням, якія прад'яўляліся да кандыдатаў у яе супрацоўнікі, і здолеў трапіць у іх лік. Яму было даручана распрацоўваць суперважную праблему: знайсці метад вытворчасці паліва з вадкага вадароду для касмічных апаратаў. Урэшце рэшт карпатлівая праца прынесла выдатны плён. Б. Кіт знайшоў спосаб атрымання касмічнага паліва, якое да гэтага часу выкарыстоўваецца ў ракетных сістэмах «Апалон» і «Шатл». Вынікі даследаванняў былі абагульнены вучоным у кнізе «Rocket Propellant Handbook», якая выйшла ў свет у 1960 г. Яна стала свайго роду падручнікам для некалькіх пакаленняў ракетных канструктараў.

У 1957 г. Савецкі Саюз запусціў у космас першы ў свеце спадарожнік Зямлі. Амерыканцы таксама актывізавалі дзейнасць у гэтым кірунку. У элітны калектыў навукоўцаў, які



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



працаваў на касмічную прамысловасць, быў уключаны і наш суайчыннік. Ён трапіў у аддзел касманаўтыкі Міжнароднай карпарацыі тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, прымаў удзел у распрацоўцы сродкаў сувязі з Месяцам.

У другой палове 1960-х гг. Б. Кіт працаваў у шэрагу прэстыжных дзяржаўных устаноў: Нацыянальным бюро стандартызацыі, Міністэрстве камерцыі, Міністэрстве камунікацыі, у Штаб-кватэры арміі і інш. Праблемы, якія даручалі яму распрацоўваць, вылучаліся надзвычайнай складанасцю і актуальнасцю.

Займаючыся даследаваннем фундаментальных навуковых праблем, Барыс Уладзіміравіч не пакідаў і сваёй любімай педагагічнай дзейнасці: выкладаў матэматыку ў Мэрылендскім універсітэце на вячэрнім факультэце.

## Сусветная вядомасць

У ЗША наш славуты суайчыннік стаў сусветна вядомым вучоным, паспяховым педагогам, тут нарадзіліся і сталі вядомымі асобамі два яго сыны. Уладзімір Кіт пайшоў па шляху бацькі і сёння ўзначальвае адзін з аддзелаў Міністэрства астранаўтыкі. Віктар займаецца мікрабіялогіяй, выдатны хірург.

Удалечыні ад Беларусі Барыса Уладзіміравіча ніколі не пакідалі думкі пра Радзіму. Яго запаветнай марай было «пабыць з Айчынай свайго лёсу». У 1972 г. ён вяртаецца ў Германію, пасяляецца ў Франкфурце-на-Майне. Прыроджаны асветнік працягвае педагагічную дзейнасць у філіяле Мэрылендскага ўніверсітэта ў якасці прафесара матэматыкі. Не спыняе і навуковай дзейнасці, працуе над доктарскай дысертацыяй, даследуе жыццё і навуковыя дасягненні славутага матэматыка XX ст. А. Зыгмунда. У 1982 г. Б. Кіт бліскуча абараняе дысертацыю.

Знакавым для Б. Кіта стаў 1991 год. Сусветная навуковая супольнасць высока ацаніла яго ўклад у асваенне космаса – Барыс Уладзіміравіч быў абраны акадэмікам Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі. Адначасова было прынята рашэнне занесці яго імя ў «капсулу часу» разам з імёнамі іншых лепшых навукоўцаў сусветнай касманаўтыкі, якая будзе адкрыта толькі праз 500 гадоў.

У 1992 годзе спраўдзілася доўгачаканая мара Барыса Кіта наведаць Бацькаўшчыну. Сусветна вядомага вучонага шчыра віталі калегі з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ён быў абраны яе замежным членам. Безумоўна, пабываў Барыс Уладзіміравіч у Карэлічах, Маладзечне і Навагрудку – гарадах, дзе распачыналася яго вірлівая асветніцкая дзейнасць. У Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі быў урачыста адкрыты аддзел, прысвечаны Б. У. Кіту. Сюды ён перадаў шэраг сваіх навуковых прац і асабістых рэчаў. Славутага земляка абралі ганаровым грамадзянінам горада. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы абраў Б. Кіта ганаровым доктарам навук, а ў Карэлічах адбыліся краязнаўчыя чытанні, падчас якіх прагучала некалькі дакладаў аб жыцці і асветніцкай дзейнасці вучонага-земляка.

Памёр Б. У. Кіт ва ўзросце 108 год 1 лютага гэтага года. Да апошняга працягваў ён займацца навукова-папулярызатарскай дзейнасцю, пакінуў цікавыя мемуары, у тым ліку і пра вядомых беларусаў, з якімі гэтаму дзівоснаму чалавеку давялося сустракацца.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## ЛІТАРАТУРА


1. **Быкаў, Васіль.** Доўгая дарога дадому. Кніга ўспамінаў / Васіль Быкаў. – Мінск: Га БТ «Кніга», 2003.
2. **Луцкевіч, Л. А.** Віленская беларуская гімназія / Л. А. Луцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 2. Беліцк – Гімн / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1997. – С. 279–280.
3. **Савік, Л.** Вяртанне / Л. Савік. – Мінск, 1993.
4. **Савік, Л.** Космас беларуса: жыццяпіс Б. Кіта, асветніка, вучонага, патрыёта / Л. Савік. – Мінск, 1996.
5. **Скараход, Алесь.** Кіт Барыс Уладзіміравіч / Алесь Скараход // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т.4. Кадэты – Ляшчэня / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1997. – С. 186–187.